**ФАКУЛЬТЭТ МАТЭМАТЫКІ І ПРЫРОДАЗНАЎСТВА,**
**МАГІЛЁЎСКІЯ АБЛАСНЫ І ГАРАДСКІ АДДЗЕЛЫ**
**ГА "БЕЛАРУСКАЕ ГЕАГРАФІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА"**

**ЗАПРАШАЮЦЬ**
**на імпрэзу з нагоды адкрыцця мемарыяльнай дошкі ў гонар 105-годдзя з дня нараджэння географа, ландшафтаведа і краязнаўцы Мікалая Станіслававіча РАТАБЫЛЬСКАГА (скульптар А.А. Вараб'ёў)**

**13 траўня (мая) 2019 г., панядзелак, а 14:00, 2-гі паверх навучальнага корпуса №3**
**МДУ імя А. А. Куляшова (Магілёў, Першамайская, 44)**

## РАТАБЫЛЬСКІ Мікалай Станіслвівіч (1914-1985)





Фізіка-географ, ландшафтавед, адзін з пачынальнікаў беларускай медыцынскай геаграфіі. Нарадзіўся 6.05.1914 г. у в. Сакольнічы Крычаўскага раёна. Скончыў геаграфічны факультэт Магілёўскага педінстытута (1936). У 1937-1939 гг. – настаўнік геаграфіі, завуч СШ у г.п. Крупкі. У 1939-1941 гг. – аспірант і асістэнт кафедры фізгеаграфіі *БДУ*. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны: камандзір узвода, перакладчык штаба часці. Дайшоў да Германіі. Пасля сканэння аспірантуры, у 1946 г. накіраваны ў родны інстытут. Кандыдат геаграфічных навук (1953). Дацэнт (1960). У 1946–1984 гг. — на выкладчыцкай працы: ст. выкладчык кафедры геаграфіі (1946–1954), **дэкан геаграфічнага** і **фізіка-матэматычнага** факультэтаў (1952–1954), заг. кафедрамі фізгеаграфіі (1954–1968, 1973–1975), краіназнаўства (1968–1973), дацэнт кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання (1975–1984). Усесаюзную вядомасць яму прынеслі сумесныя з П. А. Лярскім падручнікі для факультэтаў пачатковых класаў (педфакаў) «География» (аўтар раздзела «Общее землеведение»; 1963, 1966), «Землеведение и краеведение» (1978, 1987).

Аўтар 75 работ, у т.л. 8 дапаможнікаў, падручнікаў, кніг.